


## Яўген ГУЧОК


# Запісная мая кніжка

* * *

*Запісная мая кніжка*
*Не змяшчае адрасоў*
*Самых верных, самых блізкіх,*
*Самых выбраных сяброў,*

*Бо яны ў яе не лезуць*
*Ані гэтак, ані так,*
*Як размесціш там гарэзу —*
*Вецер, Сонца там размесціш як?*



* * *

*Ахіну я шыю маем*
*І па студзені пайду,*
*І нішто не затрымае*
*Маю лёгкую хаду.*

*Леваруч мне Слуцак будзе,*
*Ну а справа — Млечны шлях.*
*Вы святлей жывіце, людзі,*
*Каб не згінуць у вяках!*

* * *

*Радасць майму сэрцу,*
*Светласць галаве:*
*На маім балконе*
*Ластаўка жыве.*

*На маім балконе*
*Неба больш штодня,*
*Носіць яго й носіць*
*Новая радня.*

*А яшчэ вось хутка*
*Ластаўняткі будуць,*
*Яшчэ болей неба*
*Для мяне здабудуць.*

*Радасць майму сэрцу,*
*Светласць галаве:*
*На маім балконе*
*Ластаўка жыве.*

* * *

*Не трэба мне вішні,*
*Не трэба чарэшні,*
*Лячу на сустрэчу*
*З прыгожым, амаль што бязгрэшным.*

*Сама я такою буду*
*Як ён.*
*І ўзыдзе над намі*
*Зорак мільён.*

*Не проста узыдзе —*
*Рассыпле Ўсявышні*
*Найлепшыя ў свеце*
*Чарэшні і вішні.*

* * *

*Мне падае на душу з неба меса,*
*І восеньская плавіцца імгла,*
*А ў лесе захавалася пралеска*
*Ад той вясны, што так даўно прайшла.*

*Самотная, цнатлівая, амаль святая,*
*Схіляю перад ёю галаву,*
*І маладосць шчымліва ўспамінаю,*
*І нанава нібыта я жыву.*